ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1984
12
СТУДЗЕНЯ
ЧАЦВЕР
№ 2 (1415)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

"Беларускі універсітэт" тэлетайп

• Учора • Сёння • Заўтра •

### КАМАНДА БАСКЕТБАЛІСТАК

універсітэта заняла чацвёртае месца на чэмпіянаце БССР. Трэба адзначыць, што каманда была дапушчана да гульняў толькі з другога тура замест зборнай Мінскай вобласці, якая не з'явілася на спаборніцтвы.

І. УЛАДЗІМІРАЎ.

### АДБЫЎСЯ

чарговы пленум прафсаюзнага камітэта супрацоўнікаў універсітэта. На імі абмеркаваны задачы камісій прафкома і прафсаюзных бюро, якія вынікаюць з рашэнняў снежаньскага (1983 г.) Пленума ЦК КПСС.

Л. МАРЦЫЁНКА.

### У ЧАС ЗІМОВЫХ КАНІКУЛАЎ

замежныя студэнты і аспіранты, што вучацца ва універсітэце, змогуць бліжэй пазнаёміцца з архітэктурнымі пабудовамі, памятнымі мясцінамі гарадоў Савецкага Саюза: Масквы, Ленінграда, Валгаграда, Адэсы, Кіева, Ерэвана, Кішынёва, Баку, а таксама пабываць у дамах адпачынку «Чонкі» (Гомельская вобласць) і «Нарач».

З. АЛЯКСАНДРАВА.

### НОВЫМІ ЭКСПАНАТАМІ

папоўнілася выстаўка «Лепшыя выданні ў фондзе аддзела рэдкіх і каштоўных кніг бібліятэкі універсітэта». Сярод іх — факсімільныя выданні Я. Купалы «Жалейка», М. Лермантава «Казначейша», 4 том «Живого великорусского словаря» У. Даля, а таксама некаторыя мініяцюрныя выданні.

А. СЯНЬКЕВІЧ,
загадчыца аддзела
рэдкіх і каштоўных
кніг бібліятэкі.

### КОНКУРС

на лепшы фотарасказ аб ветэранах Вялікай Айчыннай вайны «Героі сярод нас», прысвечаны 40-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, арганізуе мастацкі савет і студэнцкі клуб універсітэта. Вынікі будуць падведзены ў сакавіку гэтага года і пойдуць у залік агляду-конкурсу мастацкай самадзейнасці універсітэта. Удзел у конкурсе абавязковы для ўсіх факультэтаў.

Пераможцы будуць узнагароджаны Граматамі рэктарата, прафкома і каштоўнымі падарункамі.

Э. АНІСЕНКА,
мастацкі кіраўнік
студэнцкага клуба.



## ПАРА ЎРАДЖАЮ

*СЕСІЯ ціхенька падкралася да студэнцкіх інтэрнатаў, зазірнула ў аўдыторыі, бібліятэкі. Запаланіла ўсіх сваёй прысутнасцю, разварушыла нават самых спакойных. Доўга, ой як доўга свецяцца цяпер над Свіслаччу вокны, адбіваюцца ў яе халоднай вадзе. Прыход госці заўважылі нават качкі, якія з дня ў дзень плёскаюцца ля маста, чакаючы, пакуль найбольш спагадлівыя студэнты вынесуць ім чаго-небудзь паесці.*

*СЕСІЯ!..*

*— Пачалася барацьба за ўраджай ведаў, — жартуе хтосьці і зноў закопваецца ў падручнік.*

*Барацьба за ўраджай... Штосьці ёсць істотнае ў гэтым параўнанні сесіі з гарачай парой збору ўраджаю. Поўнае напружанне ўсіх сіл, мэтанакіраванасць, уменне працаваць хутка, без мітусні, уменне змагацца без ныцця, без прыкрых, нікому не патрэбных прызнанняў аб сваёй непадрыхтаванасці... Хіба не тое самае адчувае хлебароб, убіраючы жытнёвае поле, што і студэнт, здаючы экзамены?*

*Кажуць, добра смяецца той, хто здаў экзамены. Студэнт 5 курса геаграфічнага факультэта Эдуард Ненартовіч экзамены яшчэ не здаў. Але не гэта галоўнае. Галоўнае ў тым, што ён упэўнены ў правільнасці абранага шляху, упэўнены, што без мітусні, без ныцця падрыхтуецца да іспытаў і вытрымае іх паспяхова. Упэўнены, што не здарацца з ім ніякія нечаканыя недарэчнасці.*

*Жадаем усім студэнтам такой жа ўпэўненасці!*

Тэкст і фота
С. ЦЫБУЛЬНІКА.

## НАСУСТРАЧ ВЫБАРАМ

З ПАЧУЦЦЁМ аптымізму і ўпэўненасці ў заўтрашнім дні сустрэлі савецкія людзі новы, 1984 год. Ён знамянальны тым, што 4 сакавіка па ўсёй краіне пройдуць выбары ў Вярхоўны Савет СССР.

Падрыхтоўка да іх пачалася ўжо ў мінулым годзе і праходзіць пад знакам далейшага развіцця сацыялістычнага народаўладдзя, умацавання блоку камуністаў і беспартыйных. У абстаноўцы высокай палітычнай і працоўнай актыўнасці працягваюцца ў нашай краіне сходы калектываў па вылучэнню кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Савета СССР. Савецкія людзі ўсе свае справы і намаганні накіроўваюць на дасягненне новых рубяжоў эканамічнага і сацыяльнага развіцця. Імёны лепшых сыноў і дачок Радзімы называюць выбаршчыкі. У ліку першых кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Савета СССР вылучаюцца кіраўнікі партыі і дзяржавы.

Студэнты і выкладчыкі Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна вылучылі кандыдатам па выбарчым участку № 29/104 члена Палітбюро, намесніка Старшыні Савета Міністраў СССР, міністра замежных спраў Андрэя Андрэевіча Грамыку. Кандыдатуру А. А. Грамыкі падтрымалі працоўныя калектывы Мінскага завода халадзільнікаў і вытворчага аб'яднання «Медпрэпараты».

Для далейшай арганізацыі і кіраўніцтва выбарчай кампаніяй на ўчастку ва універсітэце створаны савет агітцэнтра, куды ўвайшлі рабочыя, выкладчыкі, аспіранты, якія карыстаюцца заслужаным аўтарытэтам у калектываў факультэтаў, грамадскіх арганізацыях. Сярод іх — дацэнт юрыдычнага факультэта У. А. Раманенка, слесар вылічальнага цэнтра В. У. Васілевіч, старшая лабарантка В. У. Пупа, аспірантка Т. І. Чыгрынава, маляр М. П. Ільясава і многія іншыя.

Савет агітцэнтра зацвердзіў план работы, разгледзеў пытанні аб удзеле членаў савета ў праверцы дзейнасці, якая праводзіцца па падрыхтоўцы да выбараў. Зараз у памяшканнях інтэрнатаў універсітэта, лячэбным прафілакторыі «Шчамысліца» і ў сярэдняй школе № 12 створаны агітпункты, дзе разгарнулі сваю работу інфармацыйныя групы, адразу ж вызначыўшы тэматыку масава-прапагандысцкай работы на перыяд выбарчай кампаніі. Шырока практыкуецца правядзенне дзён адкрытага пісьма, вечароў пытанняў і адказаў, лекцый, індывідуальных і калектыўных кансультацый па пытаннях, якія цікавяць працоўных.

Выбарчая кампанія працягваецца. Яна стане яшчэ адным важным этапам у далейшым павышэнні творчай актыўнасці савецкага народа.

Ч. ВІКТАРАЎ,
наш кар.

● СУСТРЭЧА З СЕСІЯЙ ●

# ШЧАСЛІВЫХ БІЛЕТАЎ, ВЫДАТНЫХ АДКАЗАЎ!

РАНІЦА. Ля аўдыторый, то тут то там, хлопцы і дзяўчаты з канспектамі і падручнікамі ў руках. «Цішэй» — тут здаюць апошнія залікі. Затое на другім і трэцім паверсе, дзе размешчана універсітэцкая бібліятэка, больш мнагалюдна і шумна, чым звычайна. Чарга за кнігамі на абанемент ужо даволі вялікая. Бібліятэкар Марыя Леанідаўна Дробава ўважліва слухае наведвальніцу. Не прайшло і хвіліны, як дзяўчына задаволена адыходзіць з вялікім стосам падручнікаў, а Марыя Леанідаўна ўжо зноў завіхаецца ля кніжных паліц. У пакоі, дзе знаходзіцца чытальная зала прыродазнаўчых навук, крыху прыадчынены дзверы. У бібліятэчнай цішыні чуваць, як раз-пораз перагортваюцца старонкі падручнікаў ды паскрыпваюць пер'і ручак. Амаль усе месцы заняты. Старшы бібліятэкар залы Ніна Фёдараўны Бахар растлумачвае:

— **Сваю работу зала пачынае ў дзевяць гадзін. Хоць і раней у нас было шмат наведвальнікаў, але ў час сесіі іх становіцца ўсё больш і больш. Адчуваецца большая сур'ёзнасць студэнтаў. Вось і сёння: дзесяць гадзін, а зала амаль поўная. Мы, бібліятэкары, імкнёмся заўсёды задаволіць патрэбы наведвальнікаў, дапамагчы ім у выбары падручнікаў, знайсці адказ на пытанні. У перыяд сесіі бібліятэка будзе працаваць і ў нядзелю з 10 да 17 гадзін. Вельмі хочацца, каб кожны студэнт здаў сесію толькі на добра і выдатна.**

**Надыход сесіі адчуваецца і ў дэканаце механіка-матэматычнага факультэта.**

**— Мікалай Іосіфавіч, парайце, нават не ведаем, што рабіць. Праз некалькі дзён экзамен па гісторыі КПСС здаём, а тут яшчэ з залікам па англійскай мове нелады,—і расхваляваныя дзяўчаты пачалі наперабой расказваць пра сваю бяду.**

У гэтыя дні у дэканат факультэта звяртаюцца студэнты з рознымі пытаннямі і заўсёды знаходзяць тут падтрымку і дапамогу. Прафесар М. І. ЮРЧУК, дэкан факультэта, расказвае:

— **Дэканат заўсёды імкнецца аказваць дапамогу студэнтам, а ў перыяд здачы экзаменаў—асабліва. Формы гэтай дапамогі самыя розныя: гэта і кантроль бягучай паспяховасці, наведванне лекцый у час семестра, складанне аптымальнага раскладу экзаменаў і строгае захаванне палажэнняў інструкцый аб экзаменах і заліках, падняцце добрага настрою студэнтаў. Мы думаем, што гэта сесія павінна быць здадзена лепш, чым папярэдняя. Гэта ў многім вызначаецца актыўнай вучэбна-выхаваўчай работай кафедраў і грамадскіх арганізацый факультэта.**

Сесія... У час яе хвалююцца не толькі студэнты, але і выкладчыкі. У каторы раз будзе разам са студэнтамі геаграфічнага факультэта Мікалай Канстанцінавіч Чартко раніцай ісці на экзамен. У каторы раз будзе браць залікоўку ў рукі і, як строгі суддзя і добры дарадчык, уважліва слухаць адказы сваіх выхаванцаў на экзаменацыйныя білеты. 8 студзеня Мікалаю Канстанцінавічу споўнілася 50 гадоў. Дваццаць пяць з іх ён аддаў педагагічнай, навуковай і грамадскай дзейнасці. Зараз Мікалай Канстанцінавіч — дацэнт кафедры глебазнаўства і геалогіі, кандыдат геаграфічных навук:

— **У шаснаццаты раз я буду прымаць у студэнтаў сесію. Кожная сесія для мяне новая, нічым не падобная на іншыя. І кожны раз вельмі хочацца, каб студэнты здалі яе паспяхова. А для гэтага патрэбна настойлівая праца на працягу ўсяго семестра як студэнта, так і выкладчыка. У залежнасці ад таго, наколькі будзе даступнай па форме, лагічнай па зместу, эмацыянальнай па выкладанню лекцыя выкладчыка, настолькі яна будзе карыснай і для студэнта. Ну і, вядома, сістэматычная падрыхтоўка да заняткаў студэнтаў, а не перадсесійная штурмаўшчына.**

А што кажуць пра сесію самі студэнты? Для Ігара Хаменкі, студэнта фізічнага факультэта, члена камітэта камсамола гэта сесія ўжо трэцяя.

— **У студэнтаў лёгкіх сесій няма. Кожная з іх патрабуе умення засяродзіць увагу, сканцэнтраваць свае сілы. Але не правы тыя студэнты, якія на час падрыхтоўкі да экзаменаў, зарываюцца ў кнігі, не адрываюцца ад сваіх працоўных месц. Я і мае сябры лічым, што ў дзень дастаткова працаваць 8—9 гадзін, прычым праз кожныя дзве гадзіны рабіць адпачынак. Абавязкова патрэбна прагулка па свежым паветры. Тады матэрыял успрымаецца значна лепш...**

Першыя экзамены, здадзеныя ўжо амаль на ўсіх факультэтах, сведчаць, што падрыхтоўка была добрай. Поспехаў вам, студэнты, на наступных экзаменах!

**А. МАТУСЕВІЧ,**
**наш кар.**

● ТЫРАЖ — АДЗІН ЭКЗЕМПЛЯР ●

# „VITA" —

**— А вы ведаеце, што ў нашай газеце друкаваліся такія вядомыя майстры слова, як Васіль Пяскоў, Леанід Гурунц, Уладзімір Лідзін!**

**— ?!**

**— Што вы так здзівіліся! Думаеце, «Vita» — насценка, дык яна не можа пахваліцца імёнамі сваіх аўтараў!..**

**Толькі пазней, прачытаўшы ў юбілейным нумары выступленні былых рэдактараў, я даведаўся, што гэта быў спецыяльны выпуск газеты, які называўся «У рускай прыродзе». Рэдакцыя напісала пісьмы вядомым журналістам, пісьменнікам. Тыя не адмовіліся даслаць свае матэрыялы. Ад В. Пяскова прыйшлі нават здымкі. Якая факультэцкая насценка можа пахваліцца такой гісторыяй!**

ГІСТОРЫЯЙ... Лёгка працаваць, калі справа твая добра вядома ўсім, мае ўстойлівыя традыцыі. Лёгка? А калі гэтая гісторыя такая цікавая, што не-не ды і ўспомніцца кожнаму, хто падыходзіць да чарговага нумара газеты? Калі кожны, чытаючы яго, параўноўвае з тымі, якія выходзілі дзесяць, дваццаць, трыццаць гадоў назад? Думаеце, лёгка выпускаць газету сёння, калі ўсе гэтыя гады яна была на вышэйшым узроўні? Не, нялёгка. Нялёгка, адказна і... вельмі цікава.

Першы нумар газеты (у той час яна называлася «За мічурынскую навуку») выйшаў у 1948 годзе. Аднак такі выгляд, які яна мае ў сучасны момант, яна прыняла праз пяць гадоў, калі рэдактарам яе стаў Мікалай Гесь. Тады ж яна атрымала і новую назву. «Vita»— гэта значыць жыццё. І вось на працягу ўсяго гэтага часу «Vita» застаецца адной з лепшых універсітэцкіх насценак. Былі свае спады, пад'ёмы, адны аўтары развітваліся з рэдакцыяй, другія ўліваліся ў яе рады, але газета заставалася такой жа неабходнай для студэнтаў і выкладчыкаў факультэта, як і раней, калі яе першыя нумары чакаліся з нецярпеннем, прачытваліся ад першага да апошняга радка, выклікалі гарачыя спрэчкі, водгукі. І такой яна, напэўна, застанецца, пакуль будуць на біяфаку вучыцца людзі, улюбёныя ў прыроду, мастацкае слова.

Расказвае адказны рэдактар газеты малодшы навуковы супрацоўнік Галіна Палюховіч:

— **Я лічу, што «Vita» трапляе ў рукі людзей, якія нераўнадушныя да яе зместу і формы. Важна тое, што члены цяперашняй рэдакцыі з павагай адносяцца да традыцый. Але мы не застылі ў тых рамках, часта эксперыментуем. Само жыццё падказвае, якія з іх удалыя. Але «Vita» заўсёды мае свой, толькі ёй адной характэрны твар. Вы раскладзіце перада мною хоць сотню любых насценных газет, і я без памылкі пазнаю сваю.**

Працягвае размову студэнт V курса Генадзь Тукай:

— **У нас зараз сабраўся вельмі добры калектыў. І наогул, мне падабаецца, што ў рэдакцыі заўсёды весела, цікава. Я думаю, ніхто не стане аспрэчваць думку, што «Vita» выходзіць не дарэмна.**

Мы з мастаком Сяргеем Салуком разглядаем старыя выпускі газеты.

— **Мяне сюды не клікалі. Я прыйшоў добраахвотна, — нечакана загаварыў ён аб сабе. —Захацеў паглядзець, што тут робіцца. Ды так і застаўся ў рэдакцыі. Яшчэ калі вучыўся ў школе юнага біёлага, бачыў многія нумары гэтай газеты.**



● АТАКУЕМ ФАРМАЛІЗМ ●

# *Мары застаюцца... дома*

**За 30 дзён — вакол свету!.. 20 тысяч лье пад вадой!.. Хаджэнне за тры моры!.. Хто з нас у свой час не зайздросціў капітану Нэма або Афанасію Нікіціну, Хрыстафору Калумбу або Магелану — і тым, хто ўзлятаў на другі бок Месяца або спускаўся ў патаемныя зямныя нетры. І як марылася ў такія хвіліны! «Прыйдзе, прыйдзе,—запэўніваў сам сябе,—і мой момант! І я здолею пераканаць усіх у сваёй смеласці, рашучасці, упартасці, змагу падняцца і на паветраным шары, і выйсці на лодцы ў мора, і прайсці пехатой сорак кіламетраў за дзень...»**

**Ды што там казаць: адным словам—мары. Памятаю, быў у мяне знаёмы хлопец, дык ён усе задумы запісваў у асобны «Сшытак падарожжаў». Вось выраступ, казаў, усімі гэтымі мясцінамі прайдуся. Зразумела, што не аб фантастычных падарожжах марыў чалавек.**

ДАРЭЧЫ, зусім нядаўна сустрэў яго ва універсітэце. На гістарычным факультэце ён зараз займаецца. Разгаварыліся пра тое-сёе ды і закранулі гэту тэму. «Што ты, якія там вандраванні! — шчыра здзівіўся ён. — Сесія ж на носе». «Ну, гэта зразумела, — адказваю, — але не ўвесь жа год сесія працягваецца. Як там, дарэчы, тваё планы ў адпаведнасці з занатаванымі яшчэ калісьці ў «Сшытак падарожжаў»?» І тут настала мая чарга здзіўляцца. Бо чалавек, які, колькі яго памятаю, імкнуўся «абы прэч з хаты», так спакойна адказвае: «Нідзе апошнія тры гады не быў. А «Сшытак падарожжаў»... Няма яго, згубіў недзе, мо калі на новую кватэру пераязджалі. Ды і куды там на нашым факультэце сходзіш?! Яшчэ на пікнік які да Мінскага мора хлопцы самі сабой выберуцца, а каб сур'ёзнае што — марная справа».

Пасля сустрэчы той спачатку падумалася, што тут, магчыма, памылка якая, блытаніна. Як жа так, ёсць ва універсітэце клуб турыстаў, арганізуюцца паходы і падарожжы праз прафсаюзную і камсамольскую арганізацыі, на самім факультэце павінен быць турысцкі сектар. Ды, зрэшты, яшчэ з 1962 года турызм у нашым універсітэце быў уведзены ў праграму круглагадовай спартакіяды.

Але ўсе сумненні зніклі на кафедры фізічнага выхавання і спорту, калі давялося пазнаёміцца з асобнай папкай уліку турысцкіх паходаў. У графах колькасці ўдзельнікаў у шматдзённых паходах і паходах выхаднога дня насупраць радка, дзе значылася «гістфак», стаялі прочыркі. Калі гаварыць па сутнасці, то яны, як ні горка будзе пачуць гэта выкладчыкам фізкультуры на факультэце, сведчаць аб тым, што ніхто са студэнтаў гэтага факультэта не выканаў норм комплексу ГПА ў мінулым навучальным годзе. Бо існуе палажэнне, згодна з якім студэнт павінен не толькі на стадыёне, у спартыўнай зале ці басейне паказаць адпаведныя метры, мінуты і секунды, але і схадзіць у аднадзённы турысцкі паход не менш чым на 25 кіламетраў.

Так што знаёмы мой, на жаль, меў рацыю, кажучы, што «мары і зараз застаюцца... дома». Як гаворыцца, дадаць няма чаго. Але можа ёсць што сказаць адказнаму за фізічнае выхаванне на факультэце таварышу Анатолю Васільевічу Цітову?

Зазначу толькі, што звесткі аб правядзенні паходаў выхаднога дня адсутнічаюць з хімічнага факультэта і факультэта радыёфізікі і электронікі. Ёсць рацыя запытацца: а ці мелі яны, гэтыя паходы, месца? І ці не занадта спяшаліся выкладчыкі фізвыхавання, ставячы залікі студэнтам і складаючы спісы значкістаў ГПА?

А зараз звернемся да так званых справаздач — маршрутных лістоў, якія сведчаць аб тым, што тая ці іншая група прайшла пэўным маршрутам з разлікам таго, што пехатой ім давялося пераадольваць не менш чым 25 кіламетраў.

Ведаеце, што здзіўляе, калі праглядаеш маршрутныя карткі студэнтаў - турыстаў? Ну, напрыклад, тое, што ўсім ім нібыта хто заказаў хадзіць адной дарогай: «Станцыя Вязынка — Радашковічы — г. п. Заслаўль». З году ў год. Магчымы варыянты, але ў межах чыгуначнай дарогі: станцыяй бліжэй, станцыяй далей. І што цікава: якіх толькі прыгод з імі не здараецца на гэтых ужо быццам уздоўж і ўпоперак выхаджаных мясцінах. Мяркуйце самі. Вось 22 мая 1983 года пад кіраўніцтвам А. Ваец 23 студэнты ФПМ выйшлі па маршруту: станцыя Беларусь — Вязынка — г. п. Радашковічы, аб чым сведчыць карта, якую яны склалі пасля паходу. Усё, як і павінна быць, толькі ў маршрутным лісце няма адзнакі Радашковічаў...

Яшчэ адзін цікавы маршрут адкрылі для сябе будучыя географы: Масюкоўшчына — Мінск (агульная адлегласць каля 2 кіламетраў). Шэраг студэнтаў 22 і 27 мая мінулага года бадзёра праклалі тут свае сцяжынкі. На жаль, кіраўнікі гэтых груп вырашылі застацца інкогніта, але на маршрутных лістах значыцца подпіс адказнага тургрупы, выкладчыка фізкультуры на геаграфічным факультэце Анатоля Сяргеевіча Ішчанкі. Магчыма, ён ве-

# ЗНАЧЫЦЬ ЖЫЦЦЁ

**Таму нічога дзіўнага, што яна з першага курса прыцягнула да сябе. Увесь час спецыялізаваўся як мастак-карыкатурыст. Аднак—прыбавіў ён са смехам,—жаночыя твары маляваць мне ніколі не давяралі.**



Няма людзей незаменных, але без каго з цяперашніх членаў рэдакцыі было б цяжэй выпускаць газету? Большасць адказалі, што, калі не лічыць адказнага рэдактара,—без фотакарэспандэнта - чацвёртакурсніка Ігара Бышнева. Дарэчы, ён не толькі выдатна здымае, але таксама вельмі добра малюе, нядрэнна піша.

**— Майстар на ўсе рукі, — гаворыць аб ім рэдактар газеты студэнтка 3 курса Людміла Багданец.—І вельмі абавязковы чалавек. Калі патрэбны на нумар фотаздымкі, то Ігар ноч будзе сядзець, а зробіць. Прыемна з такімі людзьмі працаваць.**

Яшчэ студэнты называюць Марыну Магілеўскую і Ларысу Гаўрылюк:

**— Гэта людзі, у якіх ёсць сапраўдная карэспандэнцкая жылка. Яны па-журналісцку могуць абыграць любы факт. Тое, што яны пішуць, заўсёды кранае чытачоў.**

Магчыма, у апошнім радку ёсць перабольшанне. Але хіба гэта дрэнна, калі студэнты так упэўнены ў сваіх таварышах? Дарэчы, аб «журналісцкай жылцы». Многія былыя «вітаўцы» сталі цяпер прафесійнымі журналістамі, некаторыя часта друкуюцца ў спецыяльных часопісах, у нашых рэспубліканскіх газетах. Напрыклад, першы рэдактар Мікалай Дзмітрыевіч Гесь цяпер працуе рэдактарам выдавецтва «Полымя». Былы рэдактар Надзежда Батурыцкая стала членам Саюза журналістаў СССР, былая машыністка Людміла Харытановіч — кандыдат біялагічных навук, рэдактар «Вышэйшай школы». Так што, магчыма, хутка ў рэспубліканскай і ўсесаюзнай прэсе мы ўбачым прозвішчы членаў цяперашняй рэдакцыі газеты «Vita».

**— Патрэбна сказаць некалькі слоў пра нашага рэдактара Людмілу Багданец.—Галіна Палюховіч паглядзела на чарнавалосую дзяўчыну. —Сама адчула, як мяняюцца адносіны да справы, калі пачынаеш за яе адказваць. Здаецца, усё пачынаеш з нуля, хочацца зрабіць як мага цікавей, падняць газету на самы высокі ўзровень. Так і Люда Багданец. Раней яна магла прапусціць пасяджэнне, не прыйсці, цяпер —крый божа. У такім выпадку яна і ад сваіх падначаленых можа патрабаваць з чыстым сумленнем. А мне здаецца, гэта вельмі важна — патрабаваць з чыстым сумленнем, калі ведаеш, што ты маеш на гэта права.**

Што ні кажы, доўгая гісторыя ў газеты «Vita». Цяперашняя рэдакцыя таксама можа пахваліцца, што і яна ўнесла свой радок у летапіс газеты. Было гэта ў той дзень, калі на факультэт на святкаванне 60-годдзя універсітэта было запрошана шмат гасцей, колішніх выпускнікоў. Хлопцы і дзяўчаты тыдзень капаліся ў архіве, клеілі, рэстаўрыравалі выпускі «Vita», што захаваліся. Калі ў вучэбным корпусе развесілі гэтыя газеты, то атрымалася даўжэзная паласа з першага да восьмага паверха. Можна ўявіць сабе пачуцці гасцей, калі яны глядзелі на газету, у якой адлюстроўваўся ўвесь пасляваенны шлях факультэта. Былых студэнтаў проста немагчыма было адарваць ад яе. Яны шукалі выпускі тых гадоў, калі самі вучыліся, шукалі свае матэрыялы, заметкі аб сабе і ўспаміналі, успаміналі... А цяперашнія супрацоўнікі рэдакцыі бегалі з паверха на паверх і ніяк не маглі наглядзецца, нарадавацца, што змаглі зрабіць прыемнае старэйшым таварышам. Гэта быў сапраўдны падарунак. Тады ж выйшаў і спецыяльны нумар, прысвечаны гасцям факультэта. І зноў засвяціліся прозвішчы колішніх аўтараў, тых самых, якія выпускалі яе дзесяць, дваццаць і больш гадоў назад.

**...Ішло чарговае пасяджэнне рэдакцыі. Звычайнае, і ў той жа час незвычайнае, не падобнае на ўсе астатнія. Бо справа, якая чалавеку падабаецца, не можа стаць для яго звычайнай, хоць і будзе паўтарацца дзесяткі разоў. Ішло пасяджэнне, крочыла, бурліла, вадаварочіла. Вось-вось, іменна вадаварочіла. Таму што кожны прысутны жадаў, чаб наступны нумар атрымаўся больш цікавы за папярэдні, каб ніхто не падняўся з трэцяга на чацвёрты паверх, не спыніўшыся каля газеты. Кожны імкнуўся, каб «Vita» дайшла да чытача...**

**С. ПЛЫТКЕВІЧ,**
**наш кар.**



**НА ЗДЫМКАХ: работа над чарговым нумарам газеты працягваецца; «Вашу заметку мы крыху падрэдагавалі...» Рэдактар газеты Людміла Багданец і пяцікурснік Сяргей Несцярчук; «Будзе крытычны матэрыял!» Студэнт V курса Генадзь Тукай.**

Фота аўтара.

---

## ГАЗЕТА ВЫСТУПІЛА. ШТО ЗРОБЛЕНА?

# «Зусім не цудоўны «цуд»

ТАК НАЗЫВАЎСЯ матэрыял, змешчаны ў газеце «Беларускі універсітэт» ад 29 снежня 1983 года, у якім крытыкавалася работа эксплуатацыйна-тэхнічнага аддзела універсітэта, які не звярнуў своечасова ўвагу на тое, што дах геаграфічнага корпуса патрабуе рамонту.

Вось што нам адказаў начальнік аддзела тэхнічнай эксплуатацыі таварыш Д. М. Тарасаў:

**«Такі факт, на жаль, мае месца. Будынак геаграфічнага факультэта патрабуе капітальнага рамонту. Аддзел эксплуатацыі ў 1982 годзе аформіў заказ-заданне на падрыхтоўку праекткай дакументацыі ў 1983 годзе. Аднак дакументацыя не падрыхтавана. Прычынай з'яўляецца тое, што тэрыторыя, якая мяжуе з будынкам, занята пад будаўніцтва метрапалітэна, і таму немагчыма пакуль што зрабіць тапаграфічны здымак. Капітальны рамонт будынка назначаны на 1985 год. Цеча ў даху будзе ліквідавана да 15 студзеня гэтага года».**

---

**дае, дзе тут, паміж шасейных дарог, наблукалі яго падапечныя 25 заліковых кіламетраў?**

**Наогул, на геаграфічным факультэце ёсць вельмі здольныя да арганізацыі паходаў турысты. Яскравы прыклад — В. Шпакоўскі. 22 мая 1983 года ён адзін сабраў, экіпіраваў, зрабіў неабходныя тлумачэнні і звадзіў у паход па маршруту Ждановічы — Заслаўль — Вязынка 230(!) чалавек. Усяго — 10 груп, як значыцца па паперах. І ўсё адзін! Зараз можна толькі запытацца ў яго: чаму ні ў адным пункце, дзе праходзілі яго 10 груп, не зроблена ніякіх адзнак у маршрутных лістах. А яшчэ можна запытаць і так: ці хадзіў пад яго кіраўніцтвам наогул хто-небудзь 22 мая?**

**Свой варыянт паходаў выхаднога дня прапануюць філолагі. Усё ў іх проста. Маршрут Мінск — Вязынка. Адзінаццаць маршрутных ліскоў — адзінаццаць турысцкіх груп «выйшла ў паход» 2 мая. Ах, якім прыгожым почыркам і як акуратна ўпісаны паміж лінеечак прозвішчы аматараў да падарожжаў на філфаку. Іх 274! І, як сведчаць лісты, адзінаццаць кіраўнікоў турыстычных паходаў (усіх іх не мае ніякай мэты пералічваць) вялі гэту грамаду. Недавер да таго, што гэта быў паход, а не звычайны пікнік (хоць і масавы) на ўлонні прыроды, выклікае толькі гэты почырк, якім, быццам пад капірку, запоўнены 11 маршрутных лістоў, пасля чаго далі кіраўнікам груп падпісацца ў графе «знаёмства з тэхнікай бяспекі і паводзін у паходзе». Адным словам — бугалтэрыя, а не справа.**

**Але час рабіць і вывады: паважаныя турысты на адзначаных факультэтах, досыць гуляць у хованкі! Досыць «збірацца» ў паход 22 і 29 мая ў Вязынку. Пашкадуйце хаця б супрацоўнікаў музея Янкі Купалы, у які вы наязджаеце іменна ў гэтыя дні з году ў год, быццам нехта забараняе хадзіць у паходы цэлы год, акрамя як у гэтыя два тыдні перад залікам па фізвыхаванню. А яшчэ хочацца звярнуцца да выкладчыкаў фізкультуры, бо іменна ад іх залежыць увесь спартыўна-выхаваўчы працэс: нельга пускаць гэтую справу на самацёк і такім чынам падтрымліваць па сутнасці фіктыўныя паходы. Думаецца, было б няблага, каб кіраўнікамі ў паходах выхаднога дня з'яўляліся яны самі або выкладчыкі ці супрацоўнікі факультэтаў, якія добра ведаюць справу. Тады б такія мерапрыемствы садзейнічалі больш глыбокаму знаёмству студэнтаў і выкладчыкаў і, безумоўна, былі б усім на карысць.**

**В. ЧАРНЯЎСКІ,**
**наш кар.**

---

● ТРЫВОЖНЫ СІГНАЛ

# АПЕТЫТНЫ АБЕД— НЕ АПОШНЯЯ СПРАВА

ПАВАЖАНЫЯ СЯБРЫ! Вымушаны звярнуцца ў газету «Беларускі універсітэт». І вось з якой нагоды.

Многія студэнты гістарычнага, механіка-матэматычнага, фізічнага і іншых факультэтаў, як і я, наведваюць сталовую, што знаходзіцца ў галоўным корпусе універсітэта. Але... Усё больш і больш студэнтаў пачынаюць абыходзіць яе. Чаму?

Гэта ў значнай ступені залежыць ад работнікаў сталовай. А якасць іх працы, на жаль, у апошні час усё часцей і часцей не задавальняе. Пачнём з раніцы. Пасля першых дзвюх гадзін заняткаў зроблены вялікі перапынак для таго, каб студэнты маглі паснедаць. Адзінае месца, дзе гэта можна зрабіць,—вышэйназваная сталовая. Але ў ёй у гэты час працуе адна каса, а на раздачы страў стаяць адзін-два чалавекі. Прапускная здольнасць пры гэтым вельмі нізкая. Не прадугледжана штатным раскладам? Але ж прадугледжана ў гадзіну «пік» (з 14 да 15 гадзін), каб працавалі дзве касы і былі 3—4 работнікі на раздачы страў. Чаму ж гэта правіла адносіцца толькі да абедзеннага часу? Тады навошта той вялікі перапынак, калі немагчыма арганізаваць снеданне як належыць! Нярэдка бывае, што са сваіх рабочых месц на раздачы страў знікаюць работнікі, і там застаецца адзін чалавек, а то і ніводнага. І часта толькі намаганнямі касіра і абураных наведвальнікаў яны вяртаюцца назад.

А культура абслугоўвання? Яна знаходзіцца далёка не на належным узроўні. Не будзем браць у разлік сваркі паміж работнікамі сталовай і лаянкі, сведкамі якіх неаднаразова даводзілася быць. Возьмем, напрыклад, посуд. Занадта часта ён бывае «крыштальнай чысціні» ў адваротным сэнсе. А колькі разоў было, што ў пустой зале няма дзе прысесці — усе сталы брудныя. Пра сурвэткі і гаварыць няма чаго. Кажуць, апошні раз яны былі ў час праверкі з трэста сталовых. А якімі рыхтуюцца стравы? Якія яны на смак? І ці ведаеце вы, работнікі сталовай, якімі абразлівымі мянушкамі называюць студэнты вашу «арганізацыю»?

Можаце сказаць, што неканкрэтна, маўляў, напісана, не па днях, калі былі заўважаны недахопы. Але калі сталовая працавала, каб не было гэтых заўваг? Такія дні можна пералічыць па пальцах. Таму маё пажаданне прафсаюзнаму камітэту: патрэбна неадкладна звярнуць увагу на становішча, якое склалася ў сталовай галоўнага корпуса.

**А. КАХАНОЎСКІ,**
**студэнт гістарычнага факультэта.**

# ЛАЎРЭАТЫ ГОДА

НЯМАЛА ПОСПЕХАЎ у спартыўным жыцці універсітэта прынёс мінулы год. Нашы спартсмены добра выступалі на першынстве ВНУ рэспублікі, рэспубліканскіх і ўсесаюзных спаборніцтвах, фінальных стартах VIII летняй Спартакіяды народаў СССР, перамагалі яны і на міжнародных спаборніцтвах. Па ініцыятыве рэдакцыі газеты «Беларусі універсітэт» спартыўны клуб сумесна з камітэтам камсамола, прафкомам, кафедрай фізвыхавання і спорту ўпершыню вызначыў пяць лепшых спартсменаў універсітэта па выніках мінулага года.

**Лаўрэатамі сталі:**

**КАМАНДАР МАДЖЫДАЎ** (юрфак, I курс), майстар спорту міжнароднага класа, класічная барацьба, сярэбраны прызёр VIII летняй Спартакіяды народаў СССР, пераможца Кубка свету ў асабістым і камандным заліку;

**ГАЛІНА САВІЦКАЯ** (журфак, II курс), майстар спорту міжнароднага класа, баскетбол, бронзавы прызёр VIII летняй Спартакіяды народаў СССР, чэмпіёнка свету і Еўропы мінулага года;

**ЭЛЬМІРА ХАРАВЕЦ** (журфак, IV курс), майстар спорту, шахматы, экс-чэмпіёнка БССР, 8-е месца на VIII летняй Спартакіядзе народаў СССР;

**АЛЯКСЕЙ ПАРФІЯНОВІЧ** (супрацоўнік кафедры фізвыхавання і спорту), майстар спорту, баскетбол, 7-е месца на VIII летняй Спартакіядзе народаў СССР;

**ЭЛА ЯЎСЮК** (юрфак, II курс), майстар спорту, плаванне, прызёр чэмпіяната БССР, удзельніца VIII летняй Спартакіяды народаў СССР.

Жадаем лаўрэатам года новых спартыўных дасягненняў!



ЭЛЬМІРА ХАРАВЕЦ — студэнтка IV курса факультэта журналістыкі. Яна майстар спорту па шахматах, мацнейшая шахматыстка універсітэта. У 1981—1982 гадах спартсменка двойчы заваёўвала званне чэмпіёнкі БССР. У мінулым годзе Эла падзяліла 3—4-е месцы. У 1982 годзе ў саставе зборнай каманды ДСТ «Буравеснік» стала чэмпіёнкай СССР. Спартсменка — удзельніца VIII летняй Спартакіяды народаў СССР, дзе ў саставе каманды Беларусі яна заняла 8-е месца.

# АЛІМПІЙСКІЯ КЛОПАТЫ КАМАНДАРА МАДЖЫДАВА

**Самалёт развярнуўся, выехаў на ўзлётную паласу і пачаў паступова набіраць хуткасць. Яго колы адарваліся ад зямлі, і машына стала паднімацца ўвысь.**

**Цяпер усе клопаты, што ўзнікаюць пры зборах у дарогу, засталіся за бортам самалёта. Можна агледзецца, можна падумаць. Хутка самалёт прызямліцца ў Сафіі, а потым возьме кірунак на Афіны.**

**Афіны. Гэта слова адразу нагадвае Алімпійскія гульні. Тут пачалася іх гісторыя, і сталіца грэчаскай зямлі з'яўляецца нібы іх сімвалам.**

**Але спартсменаў чакалі іншыя спаборніцтвы. Зборная Савецкага Саюза па класічнай барацьбе ляцела змагацца за Кубак свету, старты якога павінны прайсці ў буйным грэчаскім горадзе — Салоніках. Каманда маладая, некаторыя надзелі ўпершыню форму зборнай краіны. Сярод іх — студэнт Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна Камандар Маджыдаў.**

**Аб чым ён думаў у гэтыя імгненні! Можа аб будучых спаборніцтвах! Ці аб пачатку свайго спартыўнага шляху! А можа ўспамінаў той час, калі ў яго паверылі!**

## ТОЛЬКІ ДРУГІ

ЛІПЕНЬ 1982 года выдаўся напружаным для Маджыдава — яго чакалі паядынкі на фінальных стартах VIII летняй Спартакіяды народаў СССР.

— Я хацеў выступіць як мага лепш, каб не падвесці каманду і, зразумела, нацэльваўся на высокае месца, — скажа потым Камандар.

— Маджыдаў павінен быў перамагаць, каб даказаць, і перш за ўсё сабе, што настаў яго час, што ён здольны на многае, — адкажа яго трэнер, старшы выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту Віктар Аляксандравіч Рудзянкоў.

Перамога адкрывала шлях спартсмену на чэмпіянат свету, які праходзіў у верасні ў Кіеве, перамога ўмацавала б веру ў сябе.

Усесаюзныя турніры часта называюць «малым чэмпіянатам свету». Доля праўды ў гэтым ёсць: у любой вагавой катэгорыі знойдзецца некалькі барцоў, якія маглі б стаць прызёрамі чэмпіяната свету, таму і канкурэнцыя за месца ў зборнай высокая.

«Не пашанцавала Маджыдаву,—бедавалі трэнеры беларускай каманды, — дасталіся яму амаль усе мацнейшыя».

Сапернікамі Камандара ў катэгорыі да 62 кг былі майстры спорту міжнароднага класа М. Чарняхоўскі, В. Літвінаў, якія ўжо мелі багаты вопыт выступленняў. Мінчанін прымусіў іх капітуляваць, хоць барацьба на дыване был напружанай: перавага вызначылася ўсяго некалькімі ачкамі. У фінале яго чакаў чэмпіён свету Раман Насібулаў з каманды РСФСР.

Барацьбы амаль не атрымалася. Насібулаў выйграў паядынак па ачках і заваяваў званні чэмпіёна Спартакіяды і чэмпіёна СССР. Паражэнне Камандара можна тлумачыць па-рознаму.

— Расхваляваўся я, не змог настроіць сябе, вось і прайграў. Відаць, сказалася тое, што для мяне гэта быў першы такі буйны турнір.

Барэц заваяваў сярэбраныя медалі. У беларускай зборнай такія ўзнагароды меліся толькі ў славутага Ігара Канагіна.

— Хто такі Маджыдаў? — пачалі пасля турніру наводзіць даведкі аматары спорту.

— На Спартакіядзе добра сябе зарэкамендаваў малады барэц К. Маджыдаў, — пісалі газеты.

— Расце спартсмен, — канстатавалі спецыялісты.

Камандара залічылі ў зборную краіны, але на чэмпіянат свету паехаць не ўдалося.

## ШТО ВЫЗНАЧАЕ МАДЖЫДАВА?

— ШТО ВЫЗНАЧАЕ Маджыдава? — перапытвае В. А. Рудзянкоў. — Яго апантанасць. Калі выходзіць на дыван — зусім не падобны на звычайнага Маджыдава. Куды дзеліся яго сарамлівасць, ціхмянасць. А на трэніроўках? Якія прыёмы асвоіў, асабліва ў партэры. Мяне, хоць я важу значна больш, бывае, так кіне! Стараецца хлопец. Паставіў перад сабою мэту. Якую? Пакуль сакрэт.

В. Рудзянкоў і К. Маджыдаў. Настаўнік і вучань. Сустрэліся яны ў 1982 годзе ў Запарожжы, дзе праходзіў турнір. Адзін судзіў, другі сам удзельнічаў. «Слухай, — звярнуўся адзін з трэнераў да Рудзянкова, — хлопец хоча паступаць у ваш універсітэт. Прыглядзься да яго — ня дрэнны барэц, здаецца». Рудзянкоў падышоў да Маджыдава, пазнаёміліся.

— Мне вельмі падабаецца прафесія юрыста,—падзяліўся думкамі Камандар. — Я часта бываў на спартыўных зборах у Беларусі. Спадабалася мне там, ды і ўмовы для заняткаў спортам добрыя. Думаю ва універсітэт паступаць.

А ў пачатку ліпеня хлопец паявіўся на кватэры Віктара Аляксандравіча, абклаўся падручнікамі, засеў за вучобу. Але крыху не хапіла да ажыццяўлення мары.

— Ніколі не бачыў яго такім разгубленым, — заўважае трэнер.

Восенню Камандар падаў дакументы на падрыхтоўчае аддзяленне, яго залічылі слухачом. Цяпер ён вучыцца на першым курсе юрыдычнага факультэта.

— Даволі цяжка сумяшчаць вучобу са спортам, — разважае студэнт. — Лекцыі, практычныя заняткі, трэніроўкі... Калі раней трэніраваўся 2—3 разы ў дзень, то цяпер па тры разы бываю ў спартыўнай зале толькі ў час збораў. Звычайна адна-дзве трэніроўкі ў дзень. Вучоба пакуль ідзе добра.

Класічнай барацьбой Маджыдаў займаецца сёмы год. А пачынаў ён у Баку ў спартыўнай школе. Першы поспех прыйшоў у 1980 годзе, калі ён стаў майстрам спорту, паспяхова выступіўшы на спаборніцтвах Цэнтральнага савета ДСТ «Дынама», а праз год спартсмен выйграў маладзёжны чэмпіянат краіны. У 1983 годзе яму прысвоілі званне «Майстар спорту СССР міжнароднага класа» за перамогу на міжнародным турніры імя Паддубнага і другое месца на Спартакіядзе.

За ўсім гэтым карпатлівая праца, мноства трэніровак, тысячы адпрацовак прыёмаў.

## САЛОНІКІ — МІНСК — ЛОС-АНЖЭЛЕС?

...ПАСЛЯ Афін прыляцелі ў Салонікі. Кубак свету — вялікая падзея ў жыцці грэчаскага горада. Рэкламныя плакаты, афішы, аб'явы аб спаборніцтвах можна ўбачыць усюды. Прагнозаў шмат, але амаль усе сыходзяцца на думцы, што перамога зборнай СССР, нягледзячы на тое, што яе састаў абноўлены. А хто ж будзе пераможцам у вагавых катэгорыях?

Хмурым лістападаўскім днём В. А. Рудзянкоў вёў трэніроўку са студэнтамі універсітэта.



— Як там Маджыдаў? — не цярпелася спартсменам.

— Сёння ў яго паядынкі. Толькі б не захваляваўся — гэта першы міжнародны турнір у яго. Але веру ў Маджыдава.

А праз некалькі дзён газеты напісалі пра поспех Камандара. Два залатыя медалі! За агульнакамандную і асабістую перамогу. Усе свае паядынкі Маджыдаў выйграў чыста: клаў спарніка на лапаткі або даводзіў разрыў у ліку да дванаццаці ачкоў.

— Шкада толькі, што не сустрэўся з алімпійскім чэмпіёнам Магіякісам з Грэцыі, не праверыў яго,—гаворыць спартсмен. — Ці траўма была ў яго, ці не захацеў сябе выпрабоўваць.

Пасля прыезду з турніру ў Мінск Камандар адразу ж паехаў да свайго трэнера. Яны доўга гаварылі. Адзін дзяліўся ўражаннямі, другі радаваўся за свайго выхаванца.

За поспехі, дасягнутыя ў мінулым годзе, К. Маджыдаў і В. Рудзянкоў узнагароджаны Граматамі Вярхоўнага Савета БССР.

Хутка пасля турніру Маджыдаў прыйшоў на заняткі секцыі. Хоць ён тут і не трэніруецца, але прыходзіць нярэдка, паглядзіць, пагаворыць з сябрамі.

— Віншуем, Камандар! — віталі яго таварышы. — Цяпер перамагай далей. Абавязкова прыйдзем хварэць на чэмпіянат краіны. І з чэмпіяната Еўропы рэпартажы будзем глядзець.

Дзякуй, шчырае дзякуй, — усміхаўся хлопец. — Шчаслівы, што ўсё ідзе па плану.

— А які, дарэчы, план?

— Паспяхова выступіць на чэмпіянаце краіны, які стартуе 1 лютага ў Мінску, каб потым змагацца за званне чэмпіёна кантынента.

— А далей?

— Закончыць першы курс з добрымі адзнакамі.

— А потым?

— Потым...

А можа ў планах значыцца: «Лос-Анжэлес, XXIII Алімпійскія гульні»? Можа Камандар Маджыдаў стане першым у гісторыі універсітэта алімпійскім чэмпіёнам? Тым больш, што ёсць падставы для гэтага ёсць: ён з'яўляецца першым нумарам зборнай краіны ў вагавой катэгорыі да 62 кг. Усё залежыць ад самога спартсмена.

**У. АБРАМОВІЧ,** наш кар.

**НА ЗДЫМКУ: Камандар Маджыдаў пасля трэніроўкі.**

Фота С. Плыткевіча.



БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

12 студзеня 1984 г.

Зак. 65. АТ 10010

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар В. П. ВАРАБ'ЁЎ